# Урок беларускай мовы «Складаназлучаны сказ. Знакі прыпынку паміж часткамі» (11 клас)

**С. І. Сушчыц,**
настаўнік беларускай мовы і беларускай літаратуры
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Стараюрковіцкай СШ Любанскага раёна

Выкарыстанне прыёму SWOT-аналізу з’яўляецца эфектыўным для фарміравання самастойнасці ў набыцці ведаў, для развіцця крэатыўных меркаванняў і разважанняў. Выкарыстанне прыёму SWOT-аналізу спрыяе развіццю і фарміраванню навыкаў ацэнкі і самаацэнкі, самавыхавання і самавыражэння, якія неабходныя ў любым відзе дзейнасці.

Дадзены прыём выкарыстоўваецца ў двух накірунках:

1. У пачатку ўрока на этапе актуалізацыі ведаў (вучні працуюць з матрыцай, якую прапануе настаўнік з пераблытанымі параметрамі SWOT-аналізу, рэдагуюць яе з тлумачэннем).

2. У канцы ўрока пры правядзенні рэфлексіі, дзе вучні самастойна ацэньваюць якасць набытых ведаў па састаўленай матрыцы.

**Тэма.** Складаназлучаны сказ. Знакі прыпынку паміж часткамі.

**Мэта:** мяркуецца, што да канца ўрока вучні паглыбяць веды пра пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаным сказе; замацуюць уменні правільнай пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі складаназлучаных сказаў.

**Задачы:**

- ❒ выпрацаваць уменне вызначаць межы частак простых сказаў у складзе складаназлучанага; замацаваць навык растаноўкі знакаў прыаынку ў скаладаназлучаным сказе;
- ❒ спрыяць развіццю ўменняў даследчай кампетэнтнасці: аналізаваць, даследаваць моўныя з’явы, сістэматызаваць, рабіць вывады, працаваць самастойна;
- ❒ спрыяць выхаванню фінансавай адукаванасці.

**Абсталяванне:** карткі-заданні (для правядзення бягучага кантролю), матрыца для правядзенныыыя SWOT-аналізу, табліца-блок, тэксты фінансавай тэматыкі, грашовае дрэва (намалявана на дошцы), карткі ў выглядзе беларускіх грошай з чыстым адваротным бокам.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

**Настаўнік.** Вітаю вас, паважаныя сябры. Сёння ў нас звычайны і ў той жа час незвычайны ўрок. Мы пазнаёмімся з новай тэмай, навучымся ставіць знакі прыпынку паміж часткамі складаназлучаных сказаў і ў той жа час будзем развіваць сваю фінансавую адукаванасць.

На дошцы вы бачыце грашовае дрэва, на якім на пачатку нашага ўрока зусім мала банкнот. Але гэта не бяда! Да канца ўрока мы павінны будзем апрануць наша дрэва своеасаблівымі лістамі-банкнотамі.

### II. Актывізацыя раней набытых ведаў (апытванне)

**Настаўнік.** А пачнем мы з вамі з *«Кошыка пытанняў»*

1. Што такое складаны сказ?

2. На якія віды падзяляюцца ўсе злучнікавыя сказы?

3. Які сказ мы называем складаназлучаным?

4. Пры дапамозе якіх злучнікаў звязваюцца часткі ў складаназлучаным сказе?

5. Якія часткі складаназлучанага сказа мы можам назваць раўнапраўнымі?

6. Якія часткі складаназлучанага сказа мы называем аднатыпнымі?

*Усе пытанні змешчаны на адваротным баку карткі-банкноты з выявай беларускіх грошай, якія вучні выцягваюць з кошыка. Пасля адказу вучнем на пытанне, банкнот мацуецца на дошцы, на імправізаваным грашовым дрэве.*

*Пасля апытвання на дрэве ўжо ёсць пэўная колькасць банкнот розных наміналаў. А ці ведалі вы, што кожны з банкнот прысвечаны пэўнай вобласці?*

*Паведамленне (папярэдне падрыхтавана вучнем).*

**Настаўнік.** Усяго ў Рэспубліцы Беларусь у абарачэнні знаходзяцца сем наміналаў банкнотаў - 5, 10, 20, 50, 100, 200 і 500 рублёў.

Канцэпцыя дызайну новых банкнотаў адпавядае дэвізу «Мая краіна – Беларусь» з выявай помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва на іх правых баках. Кожны банкнот прысвечаны адной з абласцей Беларусі і Мінску. 5 рублёў – Брэсцкая вобласць; 10 – Віцебская вобласць; 20 – Гомельская; 50 – Гродзенская; 100 – Мінская вобласць; 200 – Магілёўская; 500 – г. Мінск. Адпаведнасць вобласці наміналу банкнотаў вызначана ў алфавітным парадку. Адваротныя бакі банкнотаў прысвечаны самабытнасці кожнай з абласцей з гістарычнага і культурнага пунктаў гледжання (узнікненне першых паселішчаў, асветніцтва і кнігадрукаванне, паэзія, тэатр, народныя промыслы і рамёствы, навуковыя дасягненні).

Зараз я вам прапаную адкарэкціраваць матрыцу, у якой пераблытаны паказчыкі пазіцый па тэме «Складаназлучаны сказ».

| **Моцныя бакі** | **Слабыя бакі** |
|---|---|
| Патрабуюць умення правільнай пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі. | Выклікаюць цяжкасці ў пастаноўцы знакаў прыпынку паміж часткамі. |

| | |
|---|---|
| Складаны сказ, часткі якога звязваюцца паміж сабой з дапамогаю злучальнай сувяззю | Такія сказы робяць выказванне больш лаканічным, дынамічным, даюць магчымасць пазбегнуць паўтору асабовых займеннікаў |
| **Магчымасці**<br>Выкарыстанне складаназлучаных сказаў у гутарковым стылі.<br><br>Няправільнае вызначэнне граматычнай асновы | **Пагрозы**<br>Няправільная пастаноўка знакаў прыпынку паміж часткамі.<br><br>Знаходжанне складаназлучаных сказаў у тэкстах |

Абмеркаванне вынікаў, якія павінны быць наступнымі:

| | |
|---|---|
| **Моцныя бакі**<br>1.Складаны сказ, часткі якога звязваюцца паміж сабой з дапамогаю злучальнай сувяззю.<br>2.Такія сказы робяць выказванне больш лаканічным,дынамічным, даюць магчымасць пазбегнуць паўтору асабовых займеннікаў | **Слабыя бакі**<br>1.Выклікаюць цяжкасці ў пастаноўцы знакаў прыпынку паміж часткамі.<br>2.Патрабуюць умення правільнай пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі. |
| **Магчымасці**<br>1.Знаходжанне складаназлучаных сказаў у тэкстах.<br>2.Выкарыстанне складаназлучаных сказаў у гутарковым стылі | **Пагрозы**<br>1.Няправільнае вызначэнне граматычнай асновы.<br>2.Няправільная пастаноўка знакаў прыпынку паміж часткамі |

**III. Праверка дамашняга задання**

Пр. 141. Перадайце змест тэксу з дапамогай складаназлучаных сказаў.

**IV. Тлумачэнне новага матэрыялу**

1. Работа з табліцай-блокам «Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе» (Дадатак 1).

**V. Замацаванне (выяўленне неабходнасці карэкцыйнай работы).**

Запіс сказаў пад дыктоўку з тлумачэннем пастаноўкі знакаў прыпынку (каменціраванае пісьмо):

*У наш час крэдыт – распаўсюджаная рэч, і практычна кожны ў сваім жыцці сутыкаецца з неабходнасцю яго атрымання.*

*У крэдытным дагаворы павінна быць апісана сума крэдыту, тэрмін яго пагашэння, адказнасць крэдытаатрымальніка, а апошні павінен беспярэчна выконваць усе гэтыя ўмовы.*

*Крэдыт бярэцца на сапраўды сур'ёзныя і абгрунтаваныя мэты, але ва ўсіх астатніх выпадках перавагу варта аддаць назапашванню.*

Праца з падручнікам. Практыкаванне 58 (сказы вусна зачытваюцца, тлумачыцца пастаноўка знакаў прыпынку).

Праца з тэкстам.

Прачытайце тэкст (на картках) Дадатак 2. Вызначце яго стыль і тып. Выпішыце складаназлучаныя сказы і пастаўце ў іх знакі прыпынку. Зверце выкананыя заданні па ключы.

Індывідуальная работа па картцы (на дошцы).

Злучы часткі сказаў, паставіўшы патрэбныя знакі прыпынку. Вусна вызначы сэнсавыя адносіны паміж часткамі складаназлучанага сказа.

| | |
|---|---|
| *Без шчасця не будзе багацця* | *і лісты ападаюць нясмела* |
| *Беражы хлеб у куце* | *а за грошы шчасця не купіш* |
| *У гаях пажаўцела трава* | *і пранізліва-белыя камлі бяроз.* |
| *Дождж без ветру* | *а грошы зберагуцца ў вузле* |

«Хвілінка ЦТ».

У зборніках ЦТ у частцы А, 2016 год, 5 варыянтаў.

Дыягнастычны тэст, дадатак 3 (праверачная работа выконваецца на лістах-банкнотах з адваротнага боку. Потым гэтыя банкноты мацуюцца на грашовае дрэва)

**VI. Падвядзенне вынікаў**

Аналіз матрыцы:

- ✓ Ці атрымалася пазбегнуць пагроз?
- ✓ Ці засталіся слабыя бакі ў вывучэнні тэмы?

**VII. Рэфлексія**

**«Кошт працы».** Ацаніце адпаведнымі банкнотамі вынікі ўласнай працы на сеняшнім ўроку.

**VIII. Дамашняе заданне: § 11, практыкаванне 146.**

**Дадатак 1**

## Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе

| **Коска ставіцца:** | |
|---|---|
| 1. перад супраціўным злучнікамі *а, але, ды (але), аднак, затое.* | *Праплыве гук баязліва па-над лугам, ды зноў ціха-ціха стане.* |
| 2. пры паўторных злучніках. | *То насунуцца хмары, то выгляне сонца.* |
| **Коска не ставіцца перад злучнікам і, ды (і)** | |
| **1**. калі ёсць:<br>А) [Агульны член сказа] і [ ]. | *Дзе-нідзе ля ганкаў чырванелі вясновыя кветкі і зацвітаў бэз.* |

| | |
|---|---|
| Б) [Агульнае пабочнае слова] і [ ]. | *Можа, пройдзе дождж і мы трапім у лес.* |
| В) [Агульная часціца] і [ ].<br>*(Хай, няхай, толькі…)* | *Толькі верхавіны соснаў гудзелі ды шалясцелі трапяткія асіны.* |
| **2.** Калі часткі сказаў – пытальныя, пабуджальныя або клічныя сказы: | |
| А) [ ? ] і [ ? ]. | *Куды яна ідзе і што ёй трэба?* |
| Б) [ ! ] і [ ! ]. | *Колькі працы і колькі сумлення!* |
| **3**. [ **аднасастаўн.**] і [**аднасастаўн**.]. | *Шуміць у галаве і хочацца спаць.*<br>*Цішыня і прастор.* |
| **4.** [ ] і [**сама + выказнік**]. | *Ганна паставіла вячэру на стол і сама села побач.* |
| **Працяжнік ставіцца:** | |
| А) [ ] – і [ **вынік** ]. | *Дыхнула свежасцю – і лёгка стала. (параўнайце: Калі дыхнула свежасцю, то стала лёгка.)* |
| Б) [ ] – і [ **хуткая змена падзей** ]. | *Момант – і ў дзвярах паказаўся дырэктар.* |
| В) [ ] – і [ **супрацьпастаўленне** ]. | *Канец кастрычніка – і такая цяплынь на двары.* |
| **Кропка з коскай ставіцца:** | |
| [ **свае знакі прыпынку** ]; і [**свае знакі прыпынку** ]. *(паміж часткамі слабая сэнсавая сувязь).* | *Прыклад на с. 64 падручніка (правіла)* |

**Дадатак 2**

*Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Выпішыце складаназлучаныя сказы і пастаўце ў іх знакі прыпынку.*

**Грошы беларусаў**

Спачатку ў беларусаў грошай не было і іх ролю выконвалі тавары. Грашыма былі збожжа, футра і соль а першыя грошы з солі былі выпушчаны яшчэ ў Старажытным Рыме.

У нашых продкаў старажытнай плацёжнай адзінкай з’яўлялася звычайная звярыная шкурка аднак ад доўгага выкарыстання нашы футравыя грошы зашмальцоўваліся. Яны старэлі, рабіліся непрыгожымі але усё роўна заставаліся грашыма і мелі тую ж самую вартасць. Галоўнае, каб шкуркі куніц, вавёрак, гарнастаяў, собаляў былі з вусамі, кіпцюрамі, носам і хвастом. Мае ўсё гэта шкурка і яна сапраўдная. Іншаземныя падарожнікі дзівіліся з нашых грошай: лысыя, непрыгожыя шкуркі; а за іх можна купіць што толькі хочаш. Для ўнутранага рынку такіх грошай хапала аднак абмен пашырыўся і гандаль выйшаў за мясцовыя рамкі. Калі тавары давялося прадаваць за межамі, спатрэбіліся новыя грошы. І яны з’явіліся. Гэта металічныя манеты з серабра, медзі, нікелю і іншых металаў.

*Зверце выкананыя заданні па ключы.*

**Дадатак 3**

Дыягнастычны тэст **«Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе»**

*Адзначце нумары сказаў, у якіх ставіцца коска, працяжнік або коска не ставіцца. Адказы запішыце ў выглядзе:*

<u>Коска ставіцца - №…</u>

<u>Працяжнік - №…</u>

<u>Коска не ставіцца - №…</u>

1. Вада ў лодцы прыбывала і ніякая сіла не магла ўжо спыніць яе.

2. Няхай цвітуць сады і радуюцца дзеці!

3. Сярэдзіна красавіка і такі мароз.

4. Пад хмарамі дзікія ветры равуць і чуецца крык жураўліны.

5. За акном блукаюць нямыя вятры і кружыцца ціхі снег.

6. Над галавою неба сінява і неабсяжны далягляд бясконцы і сцелецца пад ногі нам трава.

7. Чалавек прывязаў каня ля плота і сам крута завярнуў за вугал.

8. Яшчэ сняжком зямлю не замяло ды халадком дыхнулі ўжо абшары.

9. Чаму часам сэрца млее і не пазбыцца ліпкіх дум?

10. Здаецца, бялейшыя сталі гнуткія бярозы і яшчэ вышэй падаліся стромкія хвойкі і елкі.

11. Здаецца, зусім нядаўна мы напісалі пісьмо і вось прыйшоў ужо адказ.

12. Яна паспешліва паставіла на стол вячэру і сама села побач.

13. Яшчэ некалькі дзён і пачнецца бярозавік.

14. Мароз і сонца.

15. Сашы было не да гэтага хараства аднак і яна звярнула ўвагу на такі цуд прыроды.

16. Ні колас на ніве не скалыхнецца ні ліст на дрэве не зварухнецца.